*Святлана Кананoвiч*

## РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ РЭГІЯНАЛЬНАЙ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ПІНКАВІЧСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ Я. КОЛАСА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На пачатку XXI стагоддзя музеефікацыяй формаў традыцыйнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Беларусі займалася значная колькасць музеяў, нягледзячы на тое, што тэрміналагічна абгрунтаванай навуковай апоры яе інвентарызацыі, уліку не існавала і, на жаль, практычна не існуе да гэтага часу. Падставай да такога сцверджання служыць шэраг акалічнасцяў. Уся сусветная музеязнаўчая супольнасць амаль як два дзесяцігоддзі прызнала паспяховае ўвасабленне музейнай дзейнасці ў такіх новаўтварэннях, як музеі пад адкрытым небам, экамузеі, жывыя музеі і г.д. Тым не менш, хваля новай музеялогіі (калі рабіць выснову па нарматыўна-прававых дакументах, на якіх грунтуецца арганізацыя музейнай работы ў Беларусі) нашу краіну амаль не закранула. У той час, як на Генеральнай канферэнцыі Міжнароднага савета музеяў (ІКОМ), што адбылася ў кастрычніку 2004 г. у Сеуле, была вызначана актуальная для ўсёй грамадскасці свету тэма – «Нематэрыяльная спадчына. Жывыя музеі». На гэтай канферэнцыі музеязнаўцы звярнуліся да праблемы нематэрыяльнай спадчыны, сфармулявалі азначэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прапанавалі класіфікацыю, абазначылі магчымыя методыкі працы музеяў з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Расійскі слоўнік музейных тэрмінаў дае наступнае азначэнне *нематэрыяльнай спадчыны* – сукупнасць, заснаваных на традыцыі, форм культурнай дзейнасці грамадскай суполкі, якія фарміруюць у яго членаў пачуццё самабытнасці і пераемнасці [2]. Асаблiва варта

падкрэсліць, што побач з тэрмінам «нематэрыяльнае» («non-material») у замежнай музеязнаўчай літаратуры часцей выкарыстоўваецца тэрмін «неасязальнае» («intangible»), што падаецца больш дакладным. Бо калі разглядаць культуру ўвогуле, то класіфікацыя традыцыйнай культуры па прынцыпу «матэрыяльнасці-нематэрыяльнасці» ўтварае антыномію культуры. У той час, як менавіта тэрмін («intangible») падкрэслівае, што маюцца на ўвазе аб'екты, не апрадмечаныя ў рэчыўнай форме. Творча-вытворчы вопыт людзей, культурныя і бытавыя здабыткі, што выказаныя ў традыцыйных дзеяннях і ўяўленнях, зафіксаваных ва ўстойлівых формах – традыцыях, – транслююцца, і ёсць *нематэрыяльная спадчына традыцыйнай беларускай культуры*. Задача музея – забяспечыць падтрыманне традыцыі і захавання альбо аднаўлення механізмаў яе перадачы. Такімі сродкамі могуць быць нематэрыяльныя («intangible») аб'екты традыцыйнай беларускай культуры. Аднак, для таго, каб заставацца часткай культурнай спадчыны, яны павінны быць уключаны ў актуальную культуру, непарыўна ўзнаўляцца, павінны дзейнічаць механізмы рэтрансляцыі ад пакалення да пакалення. Спецыфіка такой актуалізацыі ў музеі – наяўнасць пасрэдніка, жывога носьбіта традыцыі. Пры яго наяўнасці актуалізацыя ажыццяўляецца шляхам навуковай фіксацыі і наступнай паслядоўнай рэпрэзентацыі ў музейнай прасторы традыцыйнай культурнай спадчыны праз магчымасць творчага ўзаемадзеяння – музей – носьбіт традыцыйнай культуры – наведвальнік. Прыкладам такой рэпрэзентацыі ў Беларусі можа паслужыць дзейнасць Пінкавічскага краязнаўчага музея імя Я. Коласа. Выразнай адметнасцю гэтай установы з'яўляецца тое, што ён размешчаны ў вёсцы, у якой дагэтуль бытуе абрад праводзінаў зімы. Менавіта гэты абрад з'яўляецца крыніцай атрымання ведаў для новага пакалення – дзяцей і моладзі, якія наведваюць музей. Бо на фальклорна-этнаграфічных занятках ім не толькі распавядаюць пра культуру свайго краю, але «пераймаюць» ад вучняў раёна на сумесных дзействах (з носьбітамі традыцыі) знуртавання «Радавод» спевы, выканальніцкія і танцавальныя манеры, абрады, гульні. Выключна тое, што гэтыя звесткі дзеці атрымліваюць ад сваіх бабуль і дэманструюць пры музеі нярэдка з іх удзелам. Абавязковая ўмова – выкананне на мясцовым дыялекце. У кожнай з прылягаючых да музея вёсак ён свой. Такім чынам, распавядаючы прыказкі, прымаўкі, тапанімічныя легенды, спяваючы песні, дзеці і сталыя людзі (носьбыты традыцыі) разам захоўваюць адзін з аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны – мову і яе дыялекты. Акрамя таго, кожны з удзельнікаў такіх сумесных дзействаў апранаецца ў тыя строі, уласцівыя той вёсцы, якую кожны з іх прадстаўляе. Калі ж у каго не захалася адзенне ад прабабуль, тыя шыюць уласнымі рукамі строі адпаведна з расказамі сваіх бабуль. Некаторыя з рэчаў, што захоўваюцца ў музеі, даволі часта служаць узорамі для стварэння такіх нарадзелаў у тых вёсках, дзе няма больш чалавека, які б мог распавесці аб тэхналогіі вырабу той ці іншай рэчы. А ў музеі зафіксаваны (на кожную рэч складзена навуковае апісанне) тэхніка выканання, прыкладны час стварэння і ад каго атрыманы той ці іншы аб'ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра рэпрэзентацыю нематэрыяльнай культурнай спадчыны, бо згодна Канвенцыі ЮНЭСКА «Аб ахове нематэрыяльнай культурная спадчыны», мы маем справу з « ...ведамі і ўменнямі, а таксама звязанымі з імі інструментамі, прадметамі, артэфактамі...», у якіх знайшлі саё выяўленне, назапашаныя стагоддзямі, веды па тэхніцы выканання і вырабу традыцыйных строяў Піншчыны. Дзякуючы захаваным у музеі артэфактам, яны атрымалі другое жыццё і бытуюць сёння ў натуральным асяродку. Вясковая моладзь разам са сталымі жанчынамі прымае ўдзел у абрадзе «Провадаў зімы» (пасля Вялікадня людзі, пасля вячэрняй службы ў царкве водзяць, спяваючы, каля царквы танкі). Кульмінацыйны момант настае, калі «навадзіўшыся танкі», усе разам бягуць у канец сяла да ракі і прамаўляюць: «Проведома зіму на коньску доліну. Нам зіма надокучіла, усі бокі помучіла. Посталы потопталы і волокі порвалы... плыві, зіма, на Бучыва, ты нам надокучыла. Плыві, зіма, за яліну, на коньску доліну...». А калі ўдзельнікі абраду вяртаюцца назад, тады ўжо спяваюць траецкія песні. Пры гэтым, у жыхароў Пінкавіч здаўна бытуе павер'е, што чым далей яны правядуць зіму, тым хутчэй яна сыдзе.

Такім чынам, як зазначае дырэктар Пінкавічскага краязнаўчага музея імя Я. Коласа, канцэпцыя дзейнасці музея грунтуецца, перш за ўсё, на ідэі падтрымання мясцовых традыцый, рэвіталізацыі тэхналогій вырабу некаторых строяў Пінкавіч і прылеглых вёсак, актыўнае іх выкарыстанне ў працэсе рэпрэзентацыі абрадавай культуры дадзенага рэгіёну.

Асноўная каштоўнасць такой рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны заключаецца
ў здольнасці музея, як інстытута сацыяльнай памяці, аднаўляць страчаную традыцыю па сродках сведчанняў культурнай традыцыі – па сродках вывучэння тэхналогій вырабу традыцыйных строяў, гаспадарчых вырабаў, народных інструментаў і інш. Праз віталізацыю функцыянальнасці гэтых прадметаў, (**матэрыяльных увасабленнях аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны**), музей здольны аднавіць забытыя промыслы, рамёствы, абрадавае прызначэнне той альбо іншай рэчы.